**У. В. Здановіч**

# БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ ЛЕТАМ 1941 г. У БЕЛАРУСІ НА СТАРОНКАХ АЙЧЫННЫХ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ

Нягледзячы на тое, што праблема пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны не адносіцца да прыярытэтных тэм айчыннай гістарыяграфіі, летнія падзеі 1941 г. не засталіся па-за ўвагай беларускіх навукоўцаў. Баявыя дзеянні знайшлі адлюстраванне на старонках разнастайных па жанры вы-

даннях. Адной з гістарыяграфічных крыніц з'яўляюцца энцыклапедыі – выданні, якія ўяўляюць сістэматызаваныя веды, выкладзеныя ў лаканічнай форме, па той ці іншай тэме і адрасаваны шырокай аўдыторыі. У дадзеным артыкуле будуць прааналізаваны "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне", 6-томная "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі", 18-томная "Беларуская энцыклапедыя", "Ваенная энцыклапедыя", "Брест. Брэст. Brest. 1000. Энциклопедия". Аўтар паспрабуе паказаць, наколькі ўсебакова ў дадзеных выданнях адлюстраваны баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г., якое значэнне мелі летнія падзеі для далейшага ходу Вялікай Айчыннай вайны. Асноўная ўвага звернута на штурм і абарону Брэсцкай крэпасці летам 1941 г., абарону г. Віцебска і Лепельскі контрудар, баі на Дняпроўскім рубяжы пад Магілёвам, абарону г. Гомеля і контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку. Адзначым, што дадзеныя старонкі мінулай вайны да гэтага часу дыскутуюцца, а таму патрабуюць ад вучоных уважлівага і крытычнага асэнсавання.

**Абарона Брэсцкай крэпасці**

У 1990 г. было падрыхтавана першае энцыклапедычнае выданне, непасрэдна прысвечанае разглядаемым падзеям, "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: 1941–1945", у якім абарона Брэсцкай крэпасці адлюстравана ў асобным артыкуле, падрыхтаваным супрацоўніцай мемарыяльнага комплекса "Брэсцкая крэпасць-герой" Т. М. Ходцавай. Аўтар падтрымлівае высновы ранейшых даследчыкаў аб мужнасці і гераізме абаронцаў крэпасці, якіх налічвалася 3,5–4 тыс. чалавек пасля выхаду 22 чэрвеня 1941 г. з цытадэлі прыблізна паловы асабовага складу. Такім чынам, згодна з прыведзенымі дадзенымі на момант штурму ў крэпасці знаходзілася 7–8 тыс. чырвонаармейцаў. Аднак Т. М. Ходцава не называе агульную лічбу абаронцаў, як не называе і колькасць загінуўшых і параненых савецкіх салдат і афіцэраў. Не згадвае яна і пра палонных. Аўтар у рэчышчы савецкай гістарыяграфіі паведамляе, што "толькі за першыя 9 дзён абаронцы крэпасці вывелі са строю каля 1,5 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка" [1, с. 96].

Распавядаючы пра храналагічныя межы абароны, Т. М. Ходцава адзначае, што абарона Брэсцкай крэпасці працягвалася з 22 чэрвеня па канец ліпеня 1941 г. Разам з тым аўтар падкрэслівае, што пасля 30 чэрвеня "ў выніку кровапралітных баёў і вялікіх страт абарона распалася на шэраг ізаляваных ачагоў супраціўлення" [1, с. 96]. Неабходна адзначыць, што дадзеная выснова не стала новай. У часы "перабудовы" ў 1987 г. у выдавецтве "Беларуская савецкая энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі выдадзены "Брест. Энциклопедический справочник", у якім быў змешчаны аналагічны артыкул. Праведзены аналіз паказвае, што і гэты артыкул, вельмі падрабязны, таксама быў падрыхтаваны Т.М. Ходцавай, нягледзячы на адсутнасць аўтара. У артыкуле падкрэсліваецца, што пасля 30 чэрвеня "ў выніку кровапралітных баёў і вялікіх страт абарона распалася на шэраг ізаляваных ачагоў супраціўлення" [2, с. 160]. Як бачна, дадзеная выснова цалкам супадае з высновай Т.М. Ходцавай, змешчанай у энцыклапедыі "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: 1941–1945". Цікавымі падаюцца наступныя радкі: "У ліпені

камандзір 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі генерал Шліпер у «Данясенні аб заняцці Брэст-Літоўска» паведамляў : Рускія ў Брэст-Літоўску змагаліся выключна настойліва” [2, с. 160, 161]. Прыведзеная вытрымка сведчыць аб тым, што даследчыкам было вядома “Данясенне”, у якім акрамя гераізму абаронцаў крэпасці Ф. Шліпер адзначае, што да канца чэрвеня 1941 г. трапілі ў палон 101 афіцэр і 7 122 малодшых камандзіраў і радавых абаронцаў горада і крэпасці [3, с. 22]. Лічбавыя дадзеныя пра палонных у артыкуле адсутнічаюць. Аб палонных сказана : “Захапіў хворых, параненых, медперсанал, дзяцей, 23 чэрвеня гітлераўцы выкарысталі іх у якасці жывога заслону, пагнаўшы наперадзе атакуючых” [2, с. 157].

У 6-томнай “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” ў сувязі з тым, што артыкул, прысвечаны абароне Брэсцкай крэпасці, таксама падрыхтаваны Т. М. Ходцавай, па змесце і высновах ён не адрозніваецца ад адпаведнага артыкула, змешчанага ў энцыклапедыі “Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: 1941–1945” [4, с. 89, 90].

У 18-томнай “Беларускай энцыклапедыі” нягледзячы на тое, што артыкул, прысвечаны абароне Брэсцкай крэпасці, таксама падрыхтаваны Т. М. Ходцавай, па аб’ёме ён значна саступае ранейшым яе артыкулам, змешчаным у іншых энцыклапедычных выданнях. Па сутнасці, аўтар толькі акрэсліла асноўныя моманты абароны, пацвердзіўшы свае ранейшыя высновы аб двух этапах барацьбы абаронцаў крэпасці. Але адначасова Т. М. Ходцава ўпершыню прыводзіць колькасныя дадзеныя абараняўшых цытадэль чырвонаармейцаў – 7–8 тыс. воінаў [5 , с. 288].

У 2010 г. была выдадзена першая ў рэспубліцы “Ваенная энцыклапедыя Беларусі”, прызначаная, як указана ў анатацыі, для шырокага кола чытачоў, у тым ліку студэнтаў, курсантаў, навучэнцаў сярэдніх устаноў адукацыі, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі, жадае ведаць сваіх славутых землякоў, якія на працягу стагоддзяў змагаліся за радзіму. Артыкул, прысвечаны абароне Брэсцкай крэпасці, з’яўляецца скарочаным варыянтам ранейшых артыкулаў Т.М. Ходцавай і нічога новага ў асэнсаванне праблемы не ўносіць [6, с. 170].

Сярод публікацый энцыклапедычнага фармату ў лепшы бок вызначаецца падрыхтаванае да 1000-годдзя горада арыгінальнае выданне “Брест. Брэст. Brest. 1000. Энциклопедия”, у якім маецца артыкул “Героическая оборона Брестской крепости”, напісаны маладым супрацоўнікам мемарыяльнага комплекса А. В. Малочнікавым. Адносна невялікі па аб’ме ён тым не менш, хоць і нязначна, адрозніваецца ад папярэдніх публікацый. Аўтар падтрымлівае падыходы ранейшых аўтараў і падзяляе абарону на два перыяды. Новым з’яўляецца павелічэнне да 9 тыс колькасці абаронцаў. Асаблівую цікавасць выклікаюць наступныя радкі: “Часці гарнізона ажыццявілі спробу выйсці ў раёны сканцэтравання, але ўжо да 9 гадзін раніцы крэпасць была блакіравана нямецкімі войскамі” [7, с. 120]. Такім чынам атрымліваецца, што выхад закончыўся няўдала для абаронцаў. І ўсе 9 тыс. чырвонаармейцаў да канца абароны заставаліся ў крэпасці. Згадвае А. В. Малочнікаў і палонных, тым самым прызнаючы сам факт палону. “29 чэрвеня, –

адзначае аўтар, – пасля шэрага няўдалых спроб захапіць Усходні форт на Кобрынскім умацаванні, дзе абарону ўзначаліў маёр П. М. Гаўрылаў, вораг выкарыстаў паветраную бамбардзіроўку … Яго абаронцы разам з сем'ямі камандзіраў (усяго каля 400 чалавек) трапілі ў палон [7, с. 121].

Наступнай праблемай, якая знайшла адлюстраванне на старонках энцыклапедый, сталі **танкавыя баі на Віцебшчыне** ў ліпені 1941г. Абарона г. Віцебска, як адзначае М. К. Андрушчанка, "вялася з 5–11 ліпеня 1941 г. злучэннямі 22-й, 20-й, 19-й армій Заходняга фронту і апалчэнцамі Віцебска… затрымала прасоўванне ворага на Усход, прычыніла яму значныя страты" [1, с. 126]. Як бачна з пададзенага матэрыялу, канкрэтныя вынікі баёў за Віцебск не прыведзены. Дзейнасць народнага апалчэння адлюстравана ў асобным артыкуле, аўтарам якога таксама з'яўляецца М. К. Андрушчанка [1, с. 127]. Асобна выдзелены падзеі, прысвечаныя контрудару на Лепельскім напрамку, які быў "нанесены з раёна Багушэўска на ПдЗ ад Віцебска ў напрамку на Сянно і Лепель па 3-й танкавай групе нямецкіх войск" [1, с. 301]. Нягледзячы на адсутнасць у артыкуле вызначэння аб "самай буйной танкавай бітве ў сусветнай гісторыі", прыведзеныя лічбы па сутнасці дадзеную выснову пацвярджаюць. "Найбольш упартыя баі, – піша Л. У. Чапурнова, – у т. л. танкавыя (з абодвух бакоў удзельнічала да 1,5 тыс. танкаў), ішлі ў раёне на Пн ад Сянна" [1, с. 301]. Адзначым, што дадзенае вызначэнне прысутнічае ў асобным артыкуле, прысвечаным беларускай абарончай аперацыі 22 чэрвеня – 9 ліпеня 1941 г.

Практычна без змен артыкулы, прысвечаныя віцебскім падзеям, змешчаны ў 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" [4, с. 317, 319], 18-томнай "Беларускай энцыклапедыі" [8, с. 212, с. 214; 9, с. 207] і "Ваеннай энцыклапедыі Беларусі" [6, с. 251, 252].

Асобнае месца ў гісторыі летніх падзей 1941 г. займае **абарона г. Магілёва** 3 – 26 ліпеня 1941 г. Па сутнасці гэта была абарончая аперацыя – адзіная такога роду ваенная дзея ў Беларусі ў 1941 г. Праведзена яна была пасля змены старой ваеннай канцэпцыі аб вядзенні баёў толькі на чужой тэрыторыі на новую дактрыну, прадстаўленую І. Сталіну 26 чэрвеня 1941 г. начальнікам Генеральнага штаба Чырвонай арміі Г. Жукавым, наркомам абароны СССР С. Цімашэнка, намеснікам Жукава М. Ватуціным і зацверджаную І. Сталіным без адзінай заўвагі. Адной з задач новай стратэгіі, якая прадугледжвала стварэнне лініі фронту па Заходняй Дзвіне, Дняпры, Сожы праз Віцебск, Полацк, Оршу, Магілёў, Мазыр, Магілёву адводзілася роля галоўнага абарончага плацдарма.

У энцыклапедыі "Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: 1941–1945" адной з самых гераічных старонак першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны тры артыкулы: "Магілёва абарона 1941" (Б. П. Гардзееў), "Магілёўскае народнае апалчэнне 1941" (Б. П. Гардзееў) і "Буйніцкае поле" (В. С. Паваліхіна). Згодна з канцэпцыяй, якая была закладзена першапачаткова ў мемуарах вядомых военачальнікаў, кіраўнікоў і ўдзельнікаў абароны горада, у баях за Магілёў, які абаранялі нешматлікія па сваім складзе дывізіі 61-га стралковага корпуса 13-й арміі, "савецкія войскі 23-дзённымі бязлі-

таснымі баямі скавалі буйныя сілы ворага ў перыяд Смаленскай бітвы 1941, сталі магутнай перашкодай на шляху правага крыла групы арміі «Цэнтр» і нанеслі вялікія страты ўдарным сілам праціўніка” [1, с. 316]. Аднак канкрэтныя лічбы варожых страт не прыведзены. Адсутнічаюць звесткі і пра страты абаронцаў горада. У баях за горад, у эвакуацыі фабрык і заводаў, барацьбе з дыверсантамі, шпіёнамі, ахове прамысловых аб’ектаў, лініі сувязі ўдзельнічалі апалчэнцы, у склад якіх, як паведамляе аўтар адпаведнага артыкула В. П. Гардзееў, “да 10 ліпеня ўступіла больш за 12 тыс. чалавек, у т.л. на фабрыцы штучнага шоўку 600, трубаліцейным заводзе 250, мясакамбінаце 180, цагельным заводзе 120 чалавек” [1, с. 317].

З артыкула пра Буйніцкае поле даведваемся, што “13–14 ліпеня на Буйніцкім полі знаходзіўся карэспандэнт газеты «Известия» пісьменнік К. Сіманаў. Падзеі гераічнай абароны знайшлі адлюстраванне ў яго рамане «Жывыя і мёртвыя» (правобразам галоўнага героя рамана Сярпіліна з’яўляецца палкоўнік Куцепаў) і дзённіку «Розныя дні вайны». Паводле завяшчання Сіманава прах яго развеяны на Буйніцкім полі” [1, с. 103].

У 6-томнай “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, як і ў папярэднім выданні, абарона Магілёва разглядаецца ў трох артыкулах з аналагічнай назвай. У сувязі з тым, што акрамя назваў без змен засталіся і ранейшыя аўтары, артыкулы практычна паўтараюць звесткі, пададзеныя ў энцыклапедыі “Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне” [10, с. 118; 11, с. 7, с. 12, 13].

У 18-томнай “Беларускай энцыклапедыі” артыкул “Магілёва абарона 1941” змешчаны ў 9-м томе. У адрозненне ад папярэдніх выданняў аўтар не пазначаны. Праведзены аналіз сведчыць, што гэта скарочаны варыянт ранейшых артыкулаў Б. П. Гардзеева [9 , с. 445].

Нягледзячы на змену аўтара, практычна без змяненняў пакінуты артыкул, прысвечаны Магілёўскаму народнаму апалчэнню [9, с. 452].

Не адрозніваецца ад папярдніх выданняў і артыкул, у якім раскрываюцца падзеі на Буйніцкім полі. Адзначым, што яго аўтарам, як і раней, з’яўляецца В. С. Паваліхіна [5, с. 322].

Звесткі, змешчаныя ў “Ваеннай энцыклапедыі Беларусі”, не ўносяць нічога новага ў навуковае асэнсаванне падзей, якія адбываліся ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Магілёўшчыны [6, с.180, 604, 605, 606].

**Абарона Гомеля**

“Гомеля абарона 1941, – падкрэслівае Я. С. Паўлаў у адпаведным артыкуле, – вялася войскамі 21-й арміі (генерал-лейтэнант М. Р. Яфрэмаў, генерал-маёр В. М. Гардоў) Цэнтральнага фронту і апалчэнцамі 12–19 жніўня; састаўная частка Смаленскай бітвы 1941” [1, с. 175].

З артыкула “Гомельскі полк народнага апалчэння”, аўтарам якога з’яўляецца У. І. Лемяшонак, мы даведваемся, што “апалчэнцы ўдзельнічалі ў эвакуацыі фабрык і заводаў, вялі барацьбу з дыверсантамі, шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб’екты, лініі сувязі, будавалі абарончыя рубяжы. З 12 да 19 жніўня разам з войскамі Чырвонай арміі полк вёў баі за Гомель” [1, с. 174, 175].

Таксама У. І. Лемяшонак падрыхтаваў і асобны артыкул пра контрудар на Рагачоўска-Жлобінскім напрамку, які ў беларускай гістарыяграфіі называецца “Рагачоўска-Жлобінская аперацыя”, састаўная частка Смаленскай бітвы, праведзеная 63-м стралковым корпусам (камкор Л. Р. Пятроўскі), Жлобінскім (камандзір В. А. Міронаў) і Рагачоўскім (камандзір Н. Г. Каліноўскі) знішчальнымі батальёнамі 13 ліпеня – 17 жніўня 1941 г. Часці корпуса трапілі ў акружэнне і з 17 жніўня з баямі выходзілі з яго ў напрамку Гомеля. У савецкай гістарыяграфіі пра акружэнне не згадвалася [1, с. 517].

У сувязі з тым, што ў 6-томнай “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” аўтарамі артыкулаў, прысвечаных гомельскім падзеям, таксама з’яўляюцца Я. С. Паўлаў і У. І. Лемяшонак, тэкст практычна не адрозніваецца ад папярэдняга выдання [12, с. 76, с. 82; 13, с. 40, 41].

Істотна не адрозніваюцца ад ранейшых выданняў звесткі пра абарону г. Гомеля, Гомельскі полк народнага апалчэння, Рагачоўска-Жлобінскую аперацыю, нягледзячы, на адсутнасць аўтара артыкула “Гомеля абарона 1941”, змешчаныя ў 18-томнай “Беларускай энцыклапедыі” [14, с. 348, 350; 15, с. 197].

Такая ж інфармацыя, але ў скарочаным выглядзе, утрымліваецца ў “Ваеннай энцыклапедыі Беларусі” [6, с. 329, 330, 810, 811].

Праведзены кароткі і выбарачны гістарыяграфічны агляд айчынных энцыклапедычных выданняў паказвае, што ў аснове трактоўкі баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. ляжаць ацэнкі, закладзеныя яшчэ ў савецкія часы. Нягледзячы на тое, што гісторыкі беларускага перыяду паказалі не толькі перамогі і гераізм савецкіх салдат, але і трагізм паражэнняў у пачатку вайны, страты ў ходзе асобных ваенных аперацый, акружэнне і палон, дадзеныя аспекты практычна не знайшлі адлюстравання на старонках айчынных энцыклапедычных выданняў. Аўтары энцыклапедычных артыкулаў не выкарысталі дасягненняў беларускіх даследчыкаў, якія ўвялі ў навуковы ўжытак не толькі новыя айчынныя, расійскія, савецкія матэрыялы, але і нямецкія дакументы. Аднавіць рэальную карціну баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., пазбягаючы пры гэтым міфаў і стэрэатыпаў, можна толькі на падставе крытычнага аналізу разнастайных дакументаў савецкага і нямецкага паходжання і гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: 1941–1945 : энцыклапедыя / Беларус. Сав. энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

2. Брест : энцикл. справ. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1987. – 408 с.

3. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – 300 с.

4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т.1: А – Беліца. – 1993. – 494 с.

5. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 3 : Беларусы – Варанец. – 1996. – 511 с.
6. Ваенная энцыклапедыя Беларусі / рэдкал.: Л. У. Языковіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. –1136 с.
7. Брест. Брэст. Brest. 1000. Энциклопедия / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2019. – 456 с.
8. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 4 : Варанецкі – Гальфстрым. – 1997. – 480 с.
9. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 9 : Кулібін – Малаіта. – 1999. – 560 с.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. –Т. 2 : Беліцк – Гімн. – 1994. – 537 с.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 5 : М – Пуд. – 1999. – 592 с.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 3 : Гімназіі – Кадэнцыя. – 1996. – 527 с.
13. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 6. – Кн. 1 : Пузелі – Усая. – 2001. – 592 с.
14. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 5: Беларусы – Варанец. – 1996. – 511 с.
15. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 13: Праміле – Рэлаксін. – 2001. – 576 с.